**Мядзведзеў, Ц.** У трохвугольніку / Ц. Мядзведзеў // Прамень камунізма (Гарадок). – 1962. – 8 мая. – С. 2.

## У ТРОХВУГОЛЬНІКУ

Не толькі езярышчанскім і гарадоцкім партызанам была добра знаёма гэта назва. Аб ёй ведалі пад Маладзечнам і Дзвінскам, пад Себежам і Усвятамі. На ваенных картах трохвугольнік абмяжоўваўся трыма чыгункамі і шасейнымі дарогамі, што звязваюць Невель, Полацк і Віцебск. Умацоўваючы ахову гэтых магістралей, немцы трымалі ўздоўж буйныя гарнізоны, імкнуліся закрыць усе подступы да іх, устанавіць у трохвугольніку свой парадак.

Але немцам так і не ўдалося ажыццявіць сваіх намераў. У самыя цяжкія дні Вялікай Айчыннай вайны тут дзейнічалі партызанскія атрады. Яны захоўвалі Савецкую ўладу, трымалі цесную сувязь з «Вялікай зямлёй». Нават некаторы час ішлі сюды з-за лініі фронту пісьмы. Партызаны абмяркоўвалі з насельніцтвам на сходах важныя пытанні ваеннага часу, праводзілі збор сродкаў у дапамогу Савецкай Арміі.

Цэнтрам трохвугольніка была Халамершчына. Сюды вялі буйныя партызанскія шляхі. Летам 1942 года ў маісееўскіх жывёлагадоўчых памяшканнях размяшчаліся буйныя майстэрні 4-й партызанскай брыгады, якой кіраваў Н. Е. Фалалееў. Салдаты Савецкай Арміі і партызаны падцягвалі сюды пакінутыя ў лясах гарматы, трактары, машыны, якія затым перапраўляліся за фронт для нашай арміі. Тут, у Маісееве і Ісачкаве фарміраваліся буйныя калоны, якія ішлі за фронт.

Не вельмі здзівіліся ламаносаўскія жанчыны, калі ў адзін з летніх дзён на вуліцы з’явілася палутарка з чырвоным сцяжком на радыятары. У кузаве яе ляжалі маторы, а ў кабіне сядзеў намеснік камандзіра партызанскай брыгады. Праз некалькі мінут машына была ля Ерахоў. Там спыніўся на прывал вялікі атрад мабілізаваных мужчын.

У той жа дзень позна ўвечары атрад быў непадалёку ад лясгаса, падрыхтаваўся да пераходу чыгункі і шашы. Следам юнакі прыгналі сюды каля чатырохсот коней. А пазней падыйшлі пяць магутных трактараў з зенітнымі гарматамі, гул якіх даносіўся да Езярышча. Немцы думалі, што прыйшлі савецкія танкі, і прытаіліся ў бліндажах і дотах. А вялікая калона бесперашкодна пайшла да лініі фронту.

Некалькі пазней яшчэ большая калона пераходзіла чыгунку ля Бычыхі. У поцемках сярэднія рады ішоўшых згубілі пярэдніх. Дрэнна арыентуючыся, яны пайшлі ў бычыхінскі гарнізон. Немцы і паліцаі разгубіліся і кінуліся наўцёкі. А між тым, ішлі бяззбройныя людзі з заходніх абласцей нашай рэспублікі.

Толькі над Загаранамі ім удалося зноў дагнаць сваіх.

У трохвугольніку, апрача нашай брыгады, дзейнічалі атрады полацкіх, сіроцінскіх і калінінскіх партызан. Усе спробы немцаў і паліцаяў знішчыць народных мсціўцаў не мелі поспеху. Рух паяздоў на гэтых чыгунках партызаны спынялі на тыдні, месяцы. Гарэла зямля пад нагамі акупантаў. Вось чаму толькі на нашу брыгаду ў першыя дні лістапада 1942 года немцы кінулі дзве танкавыя дывізіі. Запылалі вёскі Обаль, Халамер’е, Дамінікава. Расстраляны сотні старых, жанчын, дзяцей. Але народ не скарыўся. У лясах хаваўся ён ад лютага ворага, дзе былі партызаны.

Самая жорсткая экспедыцыя карнікаў была ў студзені сорак трэцяга. Каля месяца ішлі яны «ланцугом», прачэсваючы лясы, узгоркі, хмызнякі. Многа тады загінула баявых таварышаў. Але і на гэты раз не ўдалося ім знішчыць партызан. Так ва ўсе часы нямецкай акупацыі ў трохвугольніку заставалася Савецкая ўлада.

**Ц. МЯДЗВЕДЗЕЎ,**

**былы партызан?**

**уастаўнік Езярышчанскай сярэдняй школы**